К. І. Дваранава *(г. Мінск)*

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І ЯЕ ЎВАСАБЛЕННІ Ў ТВОРЧАСЦІ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

На сёння ў значнай часткі насельніцтва не сфарміравана пісьменнага стаўлення да культурнай спадчыны, парушана тонкая сувязь паміж асобай і культурна-гістарычнай прасторай месца яе жыхарства. Таму, на жаль, шмат у каго нават не ўзнікае простая думка аб важнасці захавання культурнай прасторы, якой належыць у тым ліку творчая спадчына прыгожага пісьменства.

Літаратурная дзейнасць І.К. Кандрацьева пачалася ў Вільні. У яе вытоках было паэтычнае слова, пачынаючы пісьменнік цікавіўся «поэтическим воспроизведением на русском языке лучших белорусских народных песен, преимущественно тех, которые представляют интерес этнографический и заключают в себе нечто своеобразное, исключительно свойственное белорусской песне» (П. Лаўрынец).

«Москва, – пісаў Кандрацьеў, – эта первопрестольная столица России, сердце ее, так сказать, – представляет столько замечательного, поучительного, священного, что в силу весьма естественных движений души русской хочется знать: откуда все это? как произошло? как зародилось?». Гэта радкі з гістарычных нарысаў пісьменніка «Седая старина Москвы», выдадзеных упершыню І.А. Марозавым у 1893 г.

«Мы созерцаем Москву в это далекое прошлое с какого-либо возвышения. Прежде всего, сверкают золотые маковки церквей, залитые ярким солнцем. Затем виднеются стены, башни, часовни, хоромины, фигурные теремки и вышки, разноцветные, пестрые башенки, дома, домики, сараи, склады и среди них, там и сям, ветряные мельницы. Все это

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

поразбросано, пораскидано – то по берегам речек, то в зелени садов и рощиц. Улицы кривы и узки, площади велики и грязны, дома как бы вросли в землю. Речки еще вьются на просторе» [4, с.17].

Ён аб’ектыўна, грунтоўна, надзвычай скрупулёзна і дасканала, у дэталях апісвае гісторыю ўзнікнення, будаўніцтва, тварэння вялікага горада. Бездакорны для крытыкі, калі піша аб розных эпохах, якія пранесліся над Масквой і пакінулі ў ёй свае вечныя (нават калі яны сцёртыя нашчадкамі) сляды, пісьменнік дае вельмі дакладныя характарыстыкі ўладаранню тых або іншых гасудароў, адзначаючы ролю кожнага ў тварэнні дзяржавы Расійскай наогул і Масквы ў прыватнасці.

Цяпер і Масква, і Крэмль іншыя. Пры І. Кандрацьеве і цэркваў было куды больш, і вуліцы, плошчы, завулкі зваліся інакш.

«Вид с колокольни Ивана Великого на Москву и ее окрестности, особенно в ясную погоду, очарователен необыкновенно: видны даже села и строения, находящиеся в 30 и 40 верстах от Москвы» [4, с.111], – піша І. Кандрацьеў аб самым высокім будынку Масквы (да пачатку XVIII ст.), пабудаваным пры праўленні Барыса Гадунова ў 1600 г. «Она была построена с целью доставить жителям Москвы пособие во время страшного голода, постигшего тогда Москву и другие города России. С этой же целью предприняты были и другие сооружения и постройки городов: Белгорода, Оскола, Томска» [4, с.13].

А вось, скажам, ГУМ – ён быў пабудаваны больш за сто гадоў назад, адкрыццё яго адбылося адначасова з «прэзентацыяй» кнігі І.К. Кандрацьева. Ён – аднагодак кнігі. Але месца гэта само па сабе гістарычнае. У канцы XVI ст. па загадзе Барыса Гадунова тут былі пабудаваныя мураваныя Гандлёвыя рады. У 1812 г. яны былі моцна разбураны французамі, а пазней аднаўленыя Восіпам Баве ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

модным тады стылі ампір. Развіццё гандлю і прадпрымальніцтва ў Маскве запатрабавала перабудовы Верхніх гандлёвых радоў. Трохпавярховы будынак, пабудаваны ў 1893 г. па праекце архітэктара А.Н. Памяранцава, працягнууўся на 400 метраў і складаўся з чатырох радоў гандлёвых карпусоў, паміж карпусамі былі створаныя вуліцы-пасажы, перакрытыя лёгкімі зашклёнымі металічнымі канструкцыямі [3].

З «Седой старины» мы даведваемся, што, напрыклад, на Цвярской вуліцы захаваўся найпрыгажэйшы будынак Ангельскага клуба, дзе бывалі Пушкін, Талстой і іх героі. Чытаючы Кандрацьева і шпацыруючы па Маскве, больш ясна ўяўляецца ўнёсак кожнай эпохі, кожнага кіраўніка, архітэктараў і будаўнікоў, якія мянялі аблічча горада. Кнігі І. Кандрацьева дапамагаюць адчуць удзячнасць да пакаленняў нашых папярэднікаў, якія прычыніліся да стварэння горада – асяродка дзяржавы. Гістарычныя нарысы «Седая старина Москвы» перавыдаваліся ў нашы дні вялікімі тыражамі, да прыкладу, у 1999, 2006, 2008 гг.

Падзеям 1812 г. І. Кандрацьеў прысвячае раман «Драма на Лубянке» і аповесць «Божье знамение», адметнасцю якіх з'яўляецца сціслацсць кампазіцыі, якая тым не менш прадастаўляе шырокія магчымасці для багатага зместам дзеяння і стварэння характараў. Празаічныя кандрацьеўскія творы не складаныя па сваёй будове, фабуле, з падначаленнем усіх элементаў твора аднаму цэнтральнаму вобразу. Дзеянне адбываецца паслядоўна, са зразумелай матывіроўкай кожнай сітуацыі і ў той жа час без лішніх эпізодаў і дэталей. Асноўнай жанравай формай разглядаемых твораў з'яўляецца, як і ў старажытным эпасе, вялікая гістарычная падзея, ад зыходу якой залежыць лёс многіх народаў. Але ў адрозненне ад гераічнага эпасу ў рамане і аповесці ўзнаўляюцца лёсы людзей і кожнага чалавека асобна. Кандрацьеў не паказвае малюнкі вялікіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бітваў пад Клясціцамі, Полацкам, Смаленскам, пры Бярэзіне. Уся ўвага пісьменніка сканцэнтравана на выяўленні чалавечай, маральна-псіхалагічнай сутнасці ўдзельнікаў вайны [6, с.8].

Думаецца, гісторыя, грунтоўны этнаграфічны пласт найперш абуджаюць сённяшнюю цікавасць да творчасці І.К. Кандрацьева, жыццёвы шлях якога бярэ пачатак на беларускай зямлі.


1. *Кондратьев, И.К.* Вильна / И.К. Кондратьев // Виленский вестник. – 1869. – № 43, 17 апр.

2. *Кондратьев, И.К.* Вильна 22-го октября 1968 г. / И.К. Кондратьев // Виленский вестник. – 1868. – № 119, 24 окт.

3. *Кондратьев, И.К.* Седая старина Москвы / И.К. Кондратьев; вступ. ст. Г.Е. Миронова. – М. : Воениздат, 1996. – 526 с.

4. *Кондратьев, И.К.* Седая старина Москвы: ист. обзор и полн. указ. ее достопамятностей: соборов, монастырей, церквей, стен, дворцов, памятников, обществ. зданий, мостов, площадей, улиц, слобод, урочищ, кладбищ и проч., и проч. с подроб. ист. описанием основания Москвы и очерком ее замечат. окрестностей / И.К. Кондратьев. – М. : Цитадель, 1997. – 702 с.

5. *Лейбов, Р.* Стихотворение Тютчева и «Русская Вильна» А.Н. Муравьева: в честь 70-летия профессора Ю.М. Лотмана: сб. ст. – Тарту : Тартуский университет, 1992.

6. *Смолік, А.І.* Падзеі 1812 года ў творчай спадчыне Івана Кандрацьева / А.І. Смолік // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2012. – № 8. – С. 3–10.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ